10. Naisbitt J., *Megatrendy*, Zysk i S-ka, - Poznań, 1997.
11. Sethi D., *Siedem zasad poczucia własnej wartości*, w: *Organizacja przyszłości*,
12. Tapscott D., *Gospodarka cyfrowa. Nadzieje i niepokoje Ery Świadomości Systemowej*, Business Press, - Warszawa, 1998.

*Люкевіч У.П. (БрДУ, Брэст)*

## СУЧАСНЫ СПОРТ: НАЦЫЯНАЛІЗАЦЫЯ ЦІ ГЛАБАЛІЗАЦЫЯ

Нацыянальныя пачуцці з'яўляюцца адной з магутнейшых, калі не самай магутнай сацыяльнай сістэмай перакананняў. Іх дзейснасць захавалася да нашага часу. Гэта становіцца зразумела з гісторыі народаў, дзяржаваў і нацыяў, якія ўтварыліся пасля распаду сучасных імперыяў. Пры дапамозе рэтраспектыўнай назвы "век нацыяналізму" абазначаецца эпоха еўрапейскай гісторыі з часу Французкай рэвалюцыі, калі "нацыя" пачала разглядацца як істотны крытэрый уладкавання дзяржавы. "Нацыя" не толькі семантычна блізкая да "народа", але і да "расы", "класа", якія таксама маюць у сабе прыкметы ідэнтычнасці і адначасова адмежаванасці людскіх групаў паміж сабой і ў дачыненні да другіх супольнасцяў [8]. Таму ў цэлым нацыяналізм, з аднаго боку, абазначае ідэалогію інтэграцыі, а з другога, - часта агрэсіўную ідэалогію наяўнасці як знешіх, так і ўнутраных ворагаў. Тое самае датычыцца і патрыятызму, паняцця, якое хутчэй вызначае сацыяльна-эмацыянальнае вымярэнне "любові да Бацькаўшчыны" і часта ўжываецца дзеля больш дакладнай адметнасці ад паняцця "нацыяналізм" [12].

Такім чынам, нацыяналізм характарызуе як гістарычна-палітычныя працэсы "утварэння нацыяў", так і сацыяльна-культуральную ідэалогію ўзаемнай прыналежнасці і размежавання групаў людзей, народаў, дзяржаваў і нацыяў на грунце такіх прыкметаў, як агульная мова, гаспадарка, тэрыторыя "і разнавіднасць псіхічнай існасці, якая праяўляецца ў агульнасці культуры", як вызначыў І.Сталін у сваёй знакамітай дэфініцыі "нацыя". Н.Эліяс [6] гаворыць пра пачуццё "мы" і "звычай", якія спецыфічным спосабам сфармавалі нацыі як людскія супольнасці. Пры гэтым вырашальнае значэнне мае пытанне пра адрозненне мыслення, дзеянняў і ўспрымання з боку, скажам, беларусаў у дачыненні да французаў, палякаў, італьянцаў і г.д.

Генэзіс фізічнай культуры і спорту прыпадае менавіта на "век нацыяналізму". Разнастайныя працэсы ўтварэння нацыяў адбіваюцца не толькі на сучасным развіцці спорту, але і яны самі таксама ўнеслі свой спецыфічны ўклад ва ўтварэнне нацыяў. Больш за тое, спорту прыпісваюцца як ідэнтыфікацыйна-заснавальныя (напрыклад, камандны дух), так і адмежавальныя і агрэсіўныя (напрыклад, у дачыненні да саперніка на спаборніцтвах) сацыяльныя і палітычныя значэнні і функцыі [7].

Згодна з Д.Лангэвішэ [13], працэс утварэння нацыяў XIX стагоддзі працякаў на палітычным, гаспадарчым і сацыякультуральным узроўні. Пры гэтым, фізічную культуру і спорт трэба змяшчаць пераважна на сацыякультуральны пазём, нават калі гімнастыка ці рух сокалаў ва

Усходняй Еўропе былі палітычна матываванымі. Праз развіццё "нямецкай гімнастыкі" і "ангельскага спорту" можна наглядна паказаць дзве асноўныя мадэлі ролі і значэння фізічнай і рухавай культуры ў так званым працэсе "nation-building" (будаўніцтва нацыі). Яны ілюструюць абедзве сутнасныя традыцыі фізічнай і рухавай культуры, якія ўвайшлі ў сучаснае разуменне фізічнага выхавання, фізічнай культуры і спорту.

Гімнастыка ў Германіі напачатку была часткай буржуазна- і нацыянальна-вызваленчага руху, альбо арганізаванага ў грамадзянскім сэнсе нацыяналізму. Гэты рух выступаў як за канстытуцыю і грамадзянскія свабоды, так і за аб'яднанне нацыяў у дзяржаву. Лібералізм і нацыяналізм у Германіі былі да рэвалюцыі 1848/49 гадоў двума бакамі аднаго і таго самага медаля рэфармавання і мадэрнізацыі дзяржавы і грамадства.

Пад'ём гімнастыкі да формы нацыянальнага руху ў фізічнай культуры [10] абазначае, па-першае, заснаванне нацыянальнай гімнастычнай арганізацыі ў саюзах і задзіночаннях грамадзянаў, увядзенне яе як прадмета ў школах ва ўсіх землях Германіі паводле адзінаструктурнай і рацыянальнай сістэмы. Гэтаму істотна спрыялі задзіночанні і Нямецкая суполка гімнастыкі. Па-другое, гэтыя заняткі фізічнымі практыкаваннямі грамадзянаў і рабочых мацавалі пачуццё супольнасці народа, бо ў задзіночаннях і на гімнастычных фэстах выконваліся агульныя для ўсіх практыкаванні, традыцыйным было супольнае вясёлае баўленне часу, песні, практыкаваліся гімнастычна-нацыянальныя рытуалы і сімвалы, такія, як сцягі, значкі, святы, прамовы і парады. Па-трэцяе, у абліччы "нямецкай гімнастыкі" была створана ўласная, нацыянальная "мова" цела і рухаў, што перасягала традыцыйныя межы сацыяльнага стану, канфесіі і полу, а таксама рэгіянальнага і лакальнага паходжання, але адначасова абазначала новыя нацыянальныя межы [4]. Гімнастыка прыгатавала ў Германіі поле для нацыяналізму, якое не змаглі падрыхтаваць другія сістэмы камунікацыі, такія як мова, музыка, літаратура і мастацтва.

Ценевы бок гэтага нацыянальнага інтэграцыйнага дасягнення гімнастаў быў у тым, што яны, калі глядзець палітычна, сталі "падножным кормам зрушанага ўправа нацыяналізму" [11]. Адданасць гімнастаў "Фатэрлянду", ідэі нацыі выкарыстоўвалі нацыянальныя фюрэры ад О.Бісмарка да А.Гітлера. Яны нават запатрабавалі ад іх поўнага ўдзелу на полі бою, да смерці ўключна. Ваенная гімнастыка, ваенізаваныя практыкаванні, гімнастыка як сродак для падрыхтоўкі да вайны з'яўляліся самазразумелымі элементамі гімнастычнай культуры XX стагоддзя і знаходзіліся ў непасрэдным дачыненні да нацыянальнай ідэалогіі гімнастыкі.

Акрамя таго, нацыяналізм цывільных гімнастаў меў зместам адмежаванне і барацьбу супраць усяго, што не ўспрымалася як "нямецкае" альбо "нацыянальнае", альбо тое, што кляймілася нацыянальнымі элітамі. Сюды належалі рабочыя-сацыялісты, якія з 1893 года арганізаваліся ва ўласныя рабочыя спартыўныя задзіночанні, да якіх, дарэчы, залічваліся з 1933 года і габрэі. "Фюрэры" Нямецкага гімнастычнага саюза, якія заразіліся ідэалогіяй нацыяналізму, ўвялі ў

статут так званы “арыйскі параграф” і прынялі рашэнне пра выключэнне з НГС усіх габрэяў і марксістаў.

Але не толькі гімнасты і НГС набраліся ідэалогіі нацыяналізму. Іншыя “грамадскія” спартыўныя арганізацыі думалі, дзейнічалі і адчувалі сябе ў “нацыянальных катэгорыях”. “Грамадскія” кіраўнікі спорту дваццатых і трыццатых гадоў спрабавалі інтэрпрэтаваць спорт на нацыянальны і нямецкі капыл, хоць спорт прыйшоў з Англіі і Амерыкі і з’яўляецца інтэрнацыянальным.

“Ангельскі спорт” паўстае як некалькі іншая ў параўнанні з “нямецкай гімнастыкай” мадэль нацыянальнай фізічнай і рухавай культуры. Генэзіс спорту ў Англіі найперш грунтуецца на вялікай колькасці рэгіянальных і лакальных гульняў і спаборніцтваў, - часта ў сувязі з фэстамі, - гульнямі з мячом, альбо раннімі формамі крыкету ды розных баксёрскіх рынгавых гульняў, альбо гульняў са звярамі (напрыклад, петушыныя бойкі). Асабліва вызначаліся бокс і гонкі, якія падтрымліваліся шляхтай, і на якія ставіліся высокія сумы. Крыкет быў першым відам спорту ў Англіі, якім займалася шляхта.

Цікавасць ангельскай шляхты альбо джэнтльменскага класу да ўнармаваных, арыентаваных на спаборніцтва гульняў была перадумовай да таго, што спорт стаўся элементам ангельскай культуры, яе сутнасным відам, альбо разглядаўся ў гэтай якасці. Яшчэ ў першай палове XIX стагоддзя гэтыя “гульні” увайшлі ў адукацыйны канон “Public Schools” (Публічныя школы) і дабрапрыстойных шляхецкіх прыватных школаў. Адсюль спорт як тыпова брытанская манера гульні, спаборніцтва і баўлення вольнага часу распаўсюдзіўся ва ўсе куткі краіны, на ўсе слаі і класы насельніцтва ўключна з рабочым класам, які ўтварыўся ў гарадах у ходзе ранняй індустрыялізацыі. Уздым Англіі да ўзроўню суперкраіны прывёў да таго, што ангельскі спорт нарэшце стаў інтэрнацыянальнай альбо нават універсальнай ці глабальнай мадэллю фізічнай культуры.

Тлумачэнне, чаму менавіта ў Англіі выдатна развіўся гэты від фізічнай актыўнасці ў тым, што спорт можна разглядаць як выказнік ангельскай альбо брытанскай нацыянальнай гісторыі і культуры, ці ангельскага “звычая”. Напрыклад, вышэй цытаваны Н.Эліяс даводзіць, што генэзіс спорту інтэграваны ў развіццё ангельскага дзяржаўнага грамадства. Ён вызначаецца тым, што ў Англіі раней, чым у другіх краінах, змагла развіцца парламенцкая сістэма. Як і ў парламенце, гульні вольнага часу джэнтльменаў праводзіліся цяпер з адпаведным кантролем і паводле ўзгодненых правілаў. Кодэкс “Ethics of fair competition” змяшчае правілы гульні, што былі выказнікам стылю жыцця. Змагацца прадпісана было жорстка, страсна і праведна, але без перабірання меры і страты самакантролю.

У адрозненне ад нямецкай гімнастыкі як нацыянальнага народнага руху ангельскі спорт меў класава-спецыфічны, шляхецкі характар. Ангельскія джэнтльмены, аднак, бачылі свой спорт як уласна нацыянальны. Яны адмежаваліся ад спорту рабочых і вынайшлі “аматарскі спорт”. Толькі ў джэнтльмена была неабходная мера свабоды, незалежнасці і суверэнітэту, каб займацца спортам і захоўваць пры гэтым “правільную” паставу. Прафесійны спорт, - а гэта быў у першую чаргу спорт рабочых, не прызнаваўся спортам [1, 2].

Паколькі джэнтльмены разглядалі сябе не толькі ў якасці прадстаўнікоў ангельскага спорту, але і ў якасці гаспадароў сусветнай імперыі, то яны былі перакананыя ў тым, што іх стыль жыцця, да якога належалі таксама “sports” (спорт) і “games” (гульні), утвараў падмурак “Empire” (імперыя) ва ўласным значэнні гэтага слова. На занятках па фізічнай культуры, - у Public Schools, коледжах і ўніверсітэтах, - у адпаведнасці з іх перакананнямі выкладаліся такія дабрадзейнасці, якія былі неабходны, каб кіраваць сусветнай імпэрыяй. Таму ім не трэба было, як нямецкім гімнастам-бюргерам, выконваць практыкаванні муштровага тыпу: яны маглі толькі гуляць у свае “games for pleasure” (гульні дзеля задавальнення). Для ангельскіх элітарных гульцоў, нарэшце, было само сабой зразумелым, што іх манера займацца спортам і гуляць павінна была распаўсюдзіцца па ўсім свеце, як Union Jack (Брытанскі сцяг) і як ангельскія матэрыялы і машыны.

Асаблівая роля Англіі як сусветнай імперыі прывяла да таго, што ангельская мадэль спорту распаўсюджвалася непасрэдна як у імперыі, так і сярод шматлікіх іншых краінаў і нацыяў. У 1891 годзе Дж.Э.Купер запланаваў у рамках Пан-Брытанскага фестывалю правесці Імперскія гульні. План, праўда, потым адсунулі, бо ў гэты час адрадзіліся Алімпійскія гульні, якія адразу сталі падзеяй сусветнага маштабу, дзе, тым не менш, запанавала ангельская спартыўная мадэль. А Імперскія гульні, альбо Гульні Каралеўства, праводзяцца з 1930 года.

Роля і значэнне спорту ў адносінах да нацыянальнага пытання з пачатку XX стагоддзя змяніліся. Спорт развіўся да ўзроўню міжнароднага сродку зносінаў, набыў глабальны характар. Алімпійскія гульні і бясконцыя спаборніцтвы і гульні паміж асобнымі атлетамі і камандамі сталі сімвалізаваць сусветнае змаганне нацыяў. Спорт, пры такім бачанні, быў сімвалічнай часткай змагання народаў і нацыяў за “месца пад сонцам”. Гэта адносіцца да “веку імперыялізму”, а таксама часу паміж сусветнымі войнамі і да так званай “халоднай вайны” пасля Другой сусветнай вайны. Спорт, спартыўныя дасягненні і спартыўныя спаборніцтвы сталі сімвалізаваць адзінства і здольнасць да поспеху дзяржаваў і нацыяў лёгкім, зразумелым і паўтаральным спосабам, рабілі магчымую ідэнтыфікацыю са спартыўнымі героямі і камандамі. Пры гэтым уздзеянне спартыўных гульняў і спаборніцтваў магло выказвацца дваіста: з аднаго боку, як выказнік адчування “мы” і прэстыжу нацыянальнай дзяржавы ў дачыненні да другіх нацыянальных дзяржаваў (напрыклад, “нацыянальныя каманды” падчас Чэмпіянатаў свету па футболе і Алімпійскіх гульняў); па-другое, спартыўныя спаборніцтвы сімвалізавалі яшчэ адзінства шматнацыянальных дзяржаваў, такіх як Вялікабрытанія ці яшчэ раней перад Першай сусветнай вайной - Аўстра-Венгрыя. У матчах па рэгбі паміж Англіяй, Шатландыяй, Уэльсам ды Паўночнай Ірландыяй выказвалася тое, што пры ўсёй адметнасці Злучанага Каралеўства ў мірным, унармаваным спартыўным спаборніцтве ёсць адзіным арганізмам.

Гэты аспект слушны і для Германіі пасля Другой сусветнай вайны, калі па яе падзеле на акупацыйныя зоны, вельмі хутка былі падхопленыя ініцыятывы міжзанальных спаборніцтваў і лігаў, напрыклад, Вышэйшая ліга “Поўдзень” і г.д. Тут маглі праяўляцца пачуцці і прыхільнасці ў

прыналежнасці да адной нацыі. Акрамя таго, перамога Германіі на футбольным чэмпіянаце свету 1954 года спрыяла станаўленню новай нацыянальнай самасвядомасці немцаў пасля паразы ў II Сусветнай вайне.

Нацыяналісцкія функцыі спорту былі вельмі хутка прызнаны палітычнымі лідэрамі ва ўсіх краінах свету і мэтава выкарыстоўваліся як палітычныя сродкі. Найвыразней гэта бачна на прыкладзе Алімпійскіх гульняў, якія з'яўляюцца ідэальным форумам нацыянальна-дзяржаўных рэпрэзэнтацыяў. Згодна з вызначэннямі МАК, каманды заяўляюцца на Алімпійскія гульні Нацыянальнымі алімпійскімі камітэтамі (НАК). Пра прызнанне НАК вырашае МАК, які сам павінен з'яўляцца органам незалежных асобаў. Аднак, алімпійцы прадстаўляюць на Алімпійскіх гульнях сваю краіну, і да іх трэба ставіцца адпаведным чынам і разглядаць іх як такія. Пры ўшанаванні пераможцаў падымаюцца нацыянальныя сцягі і выконваюцца нацыянальныя гімны. П. дэ Кубэртэн, заснавальнік Алімпійскіх гульняў сучаснасці, разглядаў гэтыя нормы як сродак зрабіць унёсак у справу міжнароднага міру на падставе патрыятызму і любові да Бацькаўшчыны. Знакамітыя атлеты з розных краінаў павінны былі зыходзіцца дзеля мірнага спаборніцтва, знаёміцца і вучыцца ўзаемнаму шанаванню, - гэта тая ідэя, якую П. дэ Кубертэн вызначыў як “le respect mutuel” (узаемашанаванне) [3].

Аднак такая ідэалістычная канцэпцыя ў палітычнай практыцы часта ператваралася ў сваю процілегласць. Ужо Алімпійскія гульні 1936 года ў Берліне мэтанакіравана выкарыстоўваліся для спрыяння нацыянальнаму прэстыжу. Акрамя таго, Гульні 1936 года служылі таму, каб за мірным фасадам замаскаваць падрыхтоўку да сусветнай вайны. Нямецкія атлеты рыхтаваліся да Гульняў сістэматычна і з дапамогай дзяржавы. Яны павінны былі тады не толькі перамагчы дзеля славы нацыянал-сацыялісцкай Германіі, але і дзеля таго, каб прадэманстраваць перавагу “арыйскай расы гаспадароў”. Сцвердзіць нацыянальны прэстыж нацысты спадзяваліся таксама і выдатнай арганізацыяй, планаваннем і правядзеннем гэтага сусветнага спартыўнага фэсту, які рыхтаваўся і выкарыстоўваўся з мэтаю прапаганды, якая, бадай, ўпершыню дасягнула мільёнаў людзей дзякуючы сучасным mass media [9].

Нацыяналісцкая інструменталізацыя спорту і Алімпійскіх гульняў мела працяг пасля Другой сусветнай вайны ў фазе так званай “халоднай вайны”. У Савецкім Саюзе і асабліва ў ГДР спорт у алімпійскіх відах атрымліваў вялікае спрыянне, што звязвалася з гіганцкімі выдаткамі грошай не толькі на падрыхтоўку непасрэдна спартоўцаў, але і на навуку і персанал абслугі, таму што лідэры дзяржавы і партыі спадзяваліся дзякуючы поспехам і медалям на першынствах свету і Алімпіядах умацаваць як нацыянальны прэстыж і міжнароднае прызнанне, так і нацыянальную ідэнтычнасць насельніцтва. Змаганні атлетаў з краінаў сацыялістычнага блоку на Алімпіядах, чэмпіянатах свету і Еўропы таксама разумеліся не як мірнае спаборніцтва, а як прамы і сімвалічны выказнік барацьбы супраць класавага ворага, у якім добрыя ўсе сродкі, нават прызначаны дзяржавай допінг.

Пасля заканчэння “халоднай вайны” нацыяналістычныя імплікацыі спорту зноў змяніліся. Як і раней, важную ролю ў справе ўмацавання нацыянальнай ідэнтычнасці ўнутры краіны і дасягнення міжнароднага прэстыжу

працягваюць мець спорт і арганізацыя вялікіх сусветных спартыўных імпрэзаў кшталту першынстваў свету ці Алімпійскіх гульняў. Асабліва гэта датычыць бедных краінаў і маладых дзяржаваў і нацыяў, якія адрадзіліся пасля падзення былога Усходняга сацыялістычнага блоку, альбо нацыянальных дзяржаваў кшталту Паўднёвай Афрыкі, якая з-за палітыкі апартэіду белага ўраду з 1964 года не мела права ўдзельнічаць у Алімпіядах. Пасля таго, як рэжым апартэіду быў адменены, ПАР у 1993 годзе зноў была прынятая ў "алімпійскую сям'ю". Праз некаторы час сталіца Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі Капштадт падала заяўку на арганізацыю і правядзенне Алімпійскіх гульняў 2004 года, таму добра зразумела, што калі які горад атрымае такое права, то ўрад краіны чакае ад гэтага як эканамічных і культурных імпульсаў, так і міжнароднага палітычнага прызнання і ўмацавання ідэнтычнасці ўнутры краіны.

Спорт будзе служыць нацыяналістычным мэтам і выкарыстоўвацца дзеля іх і ў больш інтэграваным свеце пры ўсё больш уяўных глабалістычных тэндэнцыях. Спорт высокіх дасягненняў і спаборніцтвы, якія праз mass media распаўсюджваюцца на ўвесь свет, разумеюца незалежна ад свайго нацыянальнага і нацыяналістычнага кантэксту як выказнік і сімвал працэсаў універсалізацыі і глабалізацыі. Спорт стаўся універсальным узорам культуры. Ён з'яўляецца семантычна неадназначным сімвалам, які адкрыты для самых разнастайных, нават супярэчлівых трактовак.

Глабальнаму развіццю спорта адпавядае супрацьбежнае развіццё. Па-першае, з аднаго боку, назіраецца ўсё больш выразнае размежаванне паміж інтэрнацыянальным спортам высокіх дасягненняў і спаборніцтваў, і з другога, - масавым спортам, спортам вольнага часу і спортам дзеля здароўя. Гэты спорт, прыцягальнымі для публікі падзеямі тыпу Нямецкіх гімнастычных фэстаў, дацкіх "Folkelig idraet", чэскіх гімнастычных спартакіядаў, у пэўнай меры адпавядае нямецкай і шведскай традыцыі гімнастыкі, паколькі ён разумеецца і ёсць сродкам адукацыі народа, фізічнага выхавання ў шырокім сэнсе слова. Па-другое, у шмат якіх краінах зноў аднаўляюцца і ўводзяцца ва ўжытак старыя фізкультурныя гульні, фэсты і звычаі. Яны культывуюцца альбо як рэгіянальныя традыцыі (напрыклад, боўль у Паўднёвай Францыі), альбо часткова музэалізуюцца і камерцыялізуюцца дзеля прынады турыстаў (напрыклад, швейцарскае "Schwingen und Hornussen"). Часам яны таксама служаць для таго, каб аднавіць "аўтэнтычныя" і "народныя" звычаі, якія былі разбураныя ўніверсаліцкім спортам.

Гэтая нацыяналістычная ідэалогія можа быць прадстаўленая ў выглядзе "трансмадэрновых фізічных культураў", якія знайшлі пэўныя карані "народнай ідэнтычнасці" не толькі ў карэнных народаў Сібіры, Грэнландыі, Аляскі і Канады альбо Інданэзіі, але і ў народаў і нацыяў, якія выйшлі з "неакаланіяльнае начы" савецкай імперыі ў Казахстане, Татарстане і Грузіі. У іх бачыцца выказнік, першаснае праяўленне новага "культурнага змагання" аўтахтоннага насельніцтва супраць "канібалізму" сучаснага спорту [5]. У гэтых прыкладах бачны падвойны твар нацыяналізму. Гульні і спаборніцтвы могуць служыць таму, каб закласці повязі супольнасці, да чаго заклікалі яшчэ нямецкія гімнасты XIX стагоддзя.

СПІСАК ЛІТАРАТУРЫ:

1. Гуськов С.И. Любитель или профессионал? // Гуськов С.И. Любитель или профессионал? Лапутин А.Н. Гармония мускулов. - М.: Знание, 1988. - С.3-94.
2. Люкевич В.П. Спортивная этика. - Брест: Брестский госпединститут, 1991. - 69 с.
3. Coubertin P. de. Die gegenseitige Achtung. Le Respect Mutuel. Hg. v. Carl-Diem-Institut. - St. Augustin: Academia Verlag, 1988. - S.21-35.
4. Deutsch K.W. Nation und Welt // Winkler H.A. (Hrsg.). Nationalismus. - Regensburg, 1978. - S.49-67.
5. Eichberg H. Alte Spiele - Neue Feste // Pawelke R. (Hrsg.) Neue Sportkultur. - Lichtenau, 1995. - S.165-181.
6. Elias N. Studien über die Deutschen. Machtkampfe und Habitusentwicklung im 19. und 20. Jahrhunden. - Frankfurt a. M.,1990. - S.33-49.
7. Heinemann K. Einführung in die Soziologie des Sports. - Schorndorf: Hofmann, 1990. - S.5-17.
8. Kosselleck R. Volk, Nation, Nationalismus, Masse // Geschichtliche Grundbegriffe. Bd. 7. - Stuttgart, 1992. - S.141-431.
9. Kruger A. "Buying Victories is Positively Degrading": European Origins of Gevernment Pursuit of National Prestige through Sport // International Journal of the History of Sport. - 1995. - № 12. - P.183-200.
10. Kruger M. Korperkultur und Nationsbildung. Die Geschichte des Turnens in der Reichsgrundungsara. - Schorndorf: Hofmann, 1996. - S.7-27.
11. Langewiesche D., 1989
12. Langewiesche D. "... fur Volk und Vaterland kraftig zu würken...". Zur politischen und gesellschaftlichen Rolle der Turner zwischen 1811 und 1871 // Grupe O. (Hrsg.). Kulturgut oder Korperkult. Sport und Sportwissenschaft im Wandel. - Tubingen, 1990. - S.22-61.
13. Langewiesche D. Reich, Nation und Staat in der jüngeren deutschen Geschichte // Historische Zeitschrift. - 1992. - № 254. - S.341-381.
14. Langewiesche D. Die schwabische Sangerbewegung in der Gesellschaft des 19. Jahrhunderts - ein Beitrag zur kulturellen Nationsbildung // Zeitschrift fur Württembergische Landeskunde. - 1993. № 52. - S.257-301.

*Чистякова Т.Л. (БрГТУ, Брест)*

## НЕКОТОРЫЕ ПРОБЛЕМЫ РАЗВИТИЯ КУЛЬТУРЫ В ПЕРИОД ГЛОБАЛИЗАЦИИ.

Интеграционные процессы в области экономики и других сферах общественной жизни начинаются с развитием капитализма. К. Маркс писал, что интеграция ведет к созданию всемирного рынка, в результате чего производство и потребление приобретают космополитический характер, национальная замкнутость заменяется «всесторонней связью и зависимостью наций друг от друга». Западный мир вовлекает в сферу цивилизации все, даже самые отсталые народы. [2, с. 427-428]